Надзея Парчук

# Тут лёгка дыхаць

*Вершы*



***Парчук Надзея Мікалаеўна*** нарадзілася 27 верасня 1951 года ў вёсцы Ладараж Пінскага раёна. Скончыла Пінскі ўлікова-крэдытны тэхнікум. Працавала ў банкаўскай сістэме.

Аўтар васьмі кніг паэзіі. Лаўрэат літаратурнай прэміі імя У. А. Калесніка Брэсцкага аблвыканкама ў намінацыі «Паэзія» (2010).

## Каб шчасце нязгасна цвіло…

Каб рэкі паілі нас чыстай вадой,
А ў полі калоссе шумела —
Не цешмася, людзі, чужою бядой,
Каб наша, крый Бог, не паспела.

Каб лад быў у хатах, а ў душах святло,
І радасць усмешкай вітала —
Давайце маліцца за тое сяло,
Дзе нас калісь маці люляла.

Павінна хоць штосьці застацца святым
У нашых знявераных сэрцах,
Бо толькі жывём мы, пакуль даражым —
Радзімай, рачулкай, азерцам.

Каб шчасце людское нязгасна цвіло
На нашых жыццёвых сцяжынах,
Адорвайма іншых сардэчным цяплом —
Найшчодра,
нястомна,
няспынна.

## *У Ладаражы*

Як лёгка і светла тут дыхаць,
У хмаркі лунаць на плячы!
Тут нават мой бусел з буслiхай
Кружляюць вышэй аблачын.

Нішто не парушыць, здаецца,
Ціхуткую плыннасць ракі —
Ні сонца, што з высяў ільецца,
Ні шэпт задуменных ракіт.

І я тут душой спачываю,
Натхняюся роднай красой...
Ах краю мой, любы мой краю,
Дазволь наталіцца табой!

## *Праз мора блакіту*

Да зор не ідуць пехатою.
*Афарызм серба Паўле Кавачавіча*

Да зор не дайсці пехатою,
Хаця ўся прастора адкрыта.
Да зорак сягаюць душою
Праз мары, праз мора блакіту.

Як хораша свеціцца неба —
Вачэй немагчыма адвесці!
І ў кожнае зоркі патрэба:
Любоў чалавеку данесці.

Крануцца душы яго промнем,
Іскрынку святла ў ёй пакінуць,
Каб мог дабрынёю напоўніць
Усю дарагую радзіну.

Бо зоры і праўда жывыя —
Святлом чалавецтву слугуюць,
Запальваюць сэрцы людскія
І ў іх, палымяных, шчыруюць.

Да зор не дайсці пехатою,
Бо шлях да жаданых няблізкі.
Да зорак сягаюць душою —
З дзяцінства,
з маленства,
з калыскі...

## *Светлы вобраз*

Родны вобраз мілай мамы
Сніўся ў снах маіх не раз,
Як чакала каля брамы,
Выглядала ў позні час,

Як чытала нам Купалу
З непадробным пачуццём —
Нас выводзіла памалу
На шырокае жыццё.

Баслаўляла нам дарогі,
Сцежкі нашы і шляхі,
Каб не ведалі знямогі,
Не патрапілі ў грахі,

Надзяляла дабрынёю
І спагадай да людзей...
Мы з такою ж цеплынёю
Вучым гэтаму дзяцей.

Дык прысніся, мама, зноў мне,
Бо забылася сказаць:
«Я тваю пяшчоту помню!
Ты... умела акрыляць».

## *Свежаспечаны хлеб*

Шлю пашану зярняці
І табе, дзедаў серп!
З чым твой пах параўнаць мне,
Свежаспечаны хлеб?

Ці то з водарам родным
І зямелькі, і рос,
Ці то з сілай нязводнай
Неспасціжных нябёс?

І твой пах, і цябе я
Параўнаю з раллёй,
З аржаніцаю спелай
І з людской дабрынёй.

А без гэтага, знаю:
Пустата на стале.
Вось чаму праслаўляю
Свежаспечаны хлеб.

## *Буслоў радзіма...*

Штогод вяртаюцца буслы
Да нас з чужых краёў, з-за мораў,
Дзе шчасна калісь узраслі,
Бяды не ведалі і гора.

Даўно запомнілі яны,
Што Беларусь ім, нібы маці, —
Рассцеле кожнае вясны
Свае палі і сенажаці.

Тут можна буслікаў сваіх
Узгадаваць, узняць на крылы.
Тут людзі ўсе чакаюць іх,
Зямля з любоўю дорыць сілы.

## *Раніцай*

Прачнуўся світанак і плюхнуўся ў рэчку
Туды, дзе раскінуўся Мухаўца плёс,
А ветрык-свавольнік пранёсся над грэчкай
І знік нечакана ў блакіце нябёс.

І стала ў паветры зноў ціха і міла,
І стала так светла над весняй зямлёй,
Што бусел распростаў даўжэзныя крылы
І жвава падаўся да рэчкі Лясной.